# БАЕЦ ПАРТЫІ

## *Да 90-годдзя з дня нараджэння В. Ф. Шаранговіча*

Усе поспехі, дасягнутыя нашай краінай за гады Савецкай улады, непарыўна звязаны з дзейнасцю таленавітых арганізатараў працоўных мас, якія былі вылучаны Кастрычніцкай рэвалюцыяй і грамадзянскай вайной. У ліку актыўных абаронцаў Вялікага Кастрычніка і ўдзельнікаў сацыялістычнага будаўніцтва ў Беларусі па праву значыцца імя Васіля Фаміча Шаранговіча.

Васіль Шаранговіч нарадзіўся 4 сакавіка 1897 года ў вёсцы Качаны Мядзельскага раёна Мінскай вобласці. Зямельны надзел, які мела сям'я, быў малаўрадлівым, ураджаю ледзь хапала на паўгода. У 13 гадоў Шаранговіч пакінуў родную хату і пайшоў у Маладзечна зарабляць уласны кавалак хлеба. Тут ён спачатку ўладкаваўся чорнарабочым на будаўніцтва чыгункі, потым працаваў слесарам, асвоіў прафесію памочніка машыніста паравоза.

У гады першай імперыялістычнай вайны і напярэдадні сацыялістычнай рэвалюцыі да маладзечанскіх рабочых не раз прыязджалі бальшавікі з Мінска і цэнтральных прамысловых раёнаў краіны. Узахліва слухаў прамовы агітатараў рабочы Васіль Шаранговіч. Рэвалюцыйная літаратура, дзейнасць бальшавікоў-рэвалюцыянераў аказалі ўплыў на фарміраванне яго рэвалюцыйных светапоглядаў. У лютым 1917 года В. Ф. Шаранговіч уступае ў рады партыі бальшавікоў.

26 лістапада ў Маладзечна адбыўся сход рабочых і служачых чыгуначнага вузла. Яго ўдзельнікі аднадушна падтрымалі сацыялістычную рэвалюцыю, якая адбылася ў Расіі. 6 снежня ў горадзе ствараецца часовы выканком салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Разам з павятовым камітэтам партыі ён праводзіць вялікую работу па ўмацаванню Савецкай улады. Шаранговіч выбіраецца сакратаром павятовага камітэта партыі і прымае актыўны ўдзел у ажыццяўленні ідэй Кастрычніка.

У лютым 1918 года ўсталяванне Савецкай улады ў Беларусі было спынена наступленнем нямецкай арміі. Інтэрвенты захапілі амаль усю тэрыторыю Беларусі. Тут зноў з'явіліся памешчыкі і капіталісты, паўсюдна быў устаноўлены жорсткі акупацыйны рэжым. Васіль Фаміч адразу ж уключыўся ў актыўную падпольную дзейнасць: выступае перад беларускімі сялянамі з баявой рэвалюцыйнай агітацыяй. Аднойчы акупантам удалося напасці на след Шаранговіча. Падпольшчык быў кінуты ў турму. Зняволенне працягвалася тры месяцы. Смеласць і знаходлівасць дапамаглі Шаранговічу ўцячы з турмы, ён пераходзіць лінію фронта і ўступае ў рады Чырвонай Арміі.

Вясной 1919 года, карыстаючыся падтрымкай імперыялістаў Антанты, супраць Краіны Саветаў выступіла буржуазная Польшча. Урад Пілсудскага імкнуўся знішчыць уладу працоўных, усталяваць буржуазны рэжым на беларускай зямлі. У гэтыя трывожныя дні Васіль Шаранговіч, які знаходзіўся ў радах 147 палка Чырвонай Арміі, атрымлівае заданне перайсці лінію фронта і размясціцца ў тыле ворага для арганізацыі ўзброенай барацьбы супраць акупантаў.

Глухой восеньскай ноччу 1919 года з дакументамі на імя Лютовіча Васіль Фаміч перайшоў цераз лінію фронта ў акупіраваную Беларусь. В. Ф. Шаранговіч заняўся арганізацыяй партызанскіх атрадаў. 28 студзеня 1920 года ён кіруе работай першага з'езда партызан Мінскага павета. З'езд праходзіў у вёсцы Гатава каля Мінска.

— Наша справа — падарваць тыл ворага, — сказаў на гэтым з'ездзе Васіль Шаранговіч. — Трэба рабіць усё магчымае, каб кожны дзень, кожную гадзіну аслабляць сілы інтэрвентаў. Для гэтага неабходна перашкаджаць прыбыццю падмацаванняў у белапольскія часці — пускаць пад адхон эшалоны, узрываць масты, разбіраць чыгуначныя пуці.

Актыўнае выступленне беларускіх працоўных супраць акупацыйнага рэжыму ўстрывожыла белапольскае камандаванне. Карныя экспедыцыі двойчы наведваліся ў Гатава. У другі прыезд яны правялі асабліва старанныя пошукі. Абшукаўшы хаты, хлявы, салдаты выстраіліся ланцугом і пачалі прачэсваць лес. У выніку акупантам удалося схапіць групу партызан і іх кіраўніка Шаранговіча. Белапольскае камандаванне пасля жорсткіх катаванняў прыгаварыла Васіля Фаміча да расстрэлу. У познаньскай турме смяротны прыгавор быў заменены 20-гадовым турэмным зняволеннем...

Свайго абаронцу і барацьбіта за свабоду працоўныя Беларусі не забывалі. І Радзіма зрабіла ўсё, каб вырваць В. Ф. Шаранговіча з турмы. У 1921 годзе ён быў абменены Савецкім урадам і вярнуўся ў родную Беларусь. За баявыя заслугі Савецкі ўрад узнагародзіў яго ордэнам Чырвонага Сцяга і ганаровай зброяй.

З вяртаннем на Беларусь адкрываецца новая старонка ў жыцці В. Ф. Шаранговіча. З 1921 па 1923 гады ён — намеснік наркома юстыцыі рэспублікі. У 1923 годзе прызначаецца адказным работнікам Беларускага савета прафсаюзаў. Пры актыўным удзеле Шаранговіча беларускія прафсаюзы ў той час значна ўмацавалі сваю сувязь з масамі, іх дзейнасць грунтавалася на ленінскіх патрабаваннях па кіраўніцтву гаспадарчым жыццём.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы